УДК 94(476) «1921/1939»

***В.М. Мярчук***

# ЭКАНАМІЧНАЯ ЭМІГРАЦЫЯ ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў БРАЗІЛІЮ Ў 1921–1939 гг.

У артыкуле прадстаўлена інфармацыя аб эканамічнай эміграцыі заходнебеларускага насельніцтва ў Бразілію ў 1921–1939 гг. На падставе архіўных крыніц рэканструявана адміністрацыйна-тэрытарыяльнае рассяленне заходнебеларускіх эмігрантаў у штатах Бразіліі, выдзелены перыяды эміграцыі ў гэтую краіну і адлюстравана структура польска-бразільскіх мірацыйных адносін. Аўтарам выяўлены сацыяльна-эканамічныя аспекты міжваеннай эміграцыі ў Бразілію, вызначаны яе асаблівасці для заходнебеларускага рэгіёна, таксама даследавана адаптацыя заходнебеларускіх эмігрантаў, якія ў пошуках лепшага жыцця вымушаны былі распрадаваць маёмасць і пакідаць родныя мясціны для далейшай эміграцыі на бразільскія кававыя плантацыі і сельскагаспадарчыя калоніі.

## Уводзіны

У 20–30-я гг. XX ст. на тэрыторыі Заходняй Беларусі атрымала распаўсюджанне эканамічная эміграцыя ў краіны Лацінскай Амерыкі. Эміграцыйная палітыка тагачасных польскіх улад спрыяла перасяленню сельскагаспадарчага насельніцтва ў паўднёвыя рэгіёны Бразіліі. Гістарыяграфія эміграцыйнай праблематыкі 1921–1939 гг. з Заходняй Беларусі амаль не даследавана ў айчыннай гістарычнай навуцы, а пытанні эміграцыі ў паўднёвыя землі Бразіліі наогул не разглядаліся. Толькі агульную характарыстыку эміграцыі з Польшчы ў Бразілію ў вызначаны перыяд правялі польскія даследчыкі М. Куля, К. Гранёўскі, Т. Кубіна, Я. Цюрусь, Б. Жабко-Патаповіч, А. Хэмпел [1–8]. Нешматлікія працы польскіх даследчыкаў прысвечаны эміграцыі ў асобныя штаты Бразіліі: напрыклад, М. Ляпецкі апісаў сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё эмігрантаў у штаце Парана [9]. Больш дэталёвы аналіз польскай эміграцыі ў Бразілію ўзгадваецца ў манаграфіях М. Парадоўскай, З. Дабасевіча, В. Румэля [10–12]. На мяжы XX і XXI стст. у польскай гістарыяграфіі з'явіліся працы А. Гаўрышэўскага, А. Кіцінгер, М. Маліноўскага, прысвечаныя даследаванням эмігацыйнай палітыкі і інтэнсіўнасці эміграцыйных рухаў перыяду паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі [13–15]. Сярод украінскіх даследчыкаў эміграцыйнай праблематыкі 1920–30-х гг. можна вылучыць П. Качарабу і А. Шваба, якія займаліся вывучэннем эміграцыі з тэрыторыі Заходняй Украіны, але часткова закранал і Палескае ваяводства [16–17]. Улічваючы нераспрацаванасць тэмы ў беларускай гістарычнай навуцы, мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца рэканструкцыя міжваенных эміграцыйных працэсаў з Заходняй Беларусі ў паўднёвыя землі Бразіліі.

## Эвалюцыя эміграцыі заходнебеларускага насельніцтва ў Бразілію

У канцы XIX – пачатку XX стст. у Бразіліі існавала два тыпы каланізацыі: першы – прыватная сялянская каланізацыя ў штаце Рыа-Грандзі-ду-Сул, якая ў асноўным была прадстаўлена нямецкімі перасяленцамі; другая – дзяржаўная каланізацыя, якая існавала ад 1870 г. у штаце Сан-Паўлу і была звязана з працай на плантацыях кавы.

Менавіта да другога тыпу каланізацыі ў Бразіліі адносіцца і пачатковы этап эміграцыі з Заходняй Беларусі. Першы крок наладжвання польска-бразільскіх эміграцыйных адносін міжваеннага часу быў пакладзены ў 1921 г., калі бразільскі ўрад распрацаваў іміграцыйны праект аб польска-бразільскім супрацоўніцтве. Згодна праекта, бразільскія ўлады прадстаўлялі імігрантам бясплатны праезд з Гданьска да месца працаўладкавання, выдзялялі па 50–75 га зямлі на выгаднай 10-гадовай выплаце і дапамагалі абжыцца на зямельнай гаспадарцы. 7 ліпеня 1921 г. адбылося пасяджэнне Варшаўскага

эміграцыйнага ўпраўлення з удзелам прадстаўнікоў міністэрстваў, на якім былі прыняты артыкулы праекта. Аднак у хуткім часе вызначылася, што бразільскі ўрад не здольны арганізаваць фінансавую дапамогу імігрантам з Усходняй Еўропы, што прыпыніла рэалізацыю праекта [18, с. 94]. Нягледзячы на складанасці, якія ўзнікалі пры арганізацыі міграцыйных працэсаў, першыя эмігранты з Заходняй Беларусі з'явіліся ў паўднёвых рэгіёнах Бразіліі ў 1923 г.

У штаце Сан-Паўлу назіраўся недахоп працоўных рук на плантацыях кавы – мясцовыя арандатары былі зацікаўлены ў пастаўцы замежнай рабочай сілы, што выклікала актыўную дзейнасць міграцыйных агентаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. З гэтай нагоды федэральныя ўлады Бразіліі дазволілі арандатарам выдзяляць сродкі на бясплатную транспарціроўку эмігрантаў у форме акрэдытавання будучай працы, а таксама аказваць дапамогу пры пакупцы зямельнай гаспадаркі. Пасля гэтага агенты мараходных таварыстваў пачалі шырокамаштабную агітацыю на заходнебеларускіх землях, заахвочваючы эміграцыю ў Бразіліі. 6 студзеня 1921 г. бразільскім урадам быў прыняты дэкрэт, які каардынаваў працэсы замежнай іміграцыі. Асноўная ідэя дэкрэта заключалася ў прадухіленні ўезду ў краіну «ненадзейных людзей» [19, с. 91–92].

Такім чынам, у першай палове 1920-х гг. асноўным накірункам бразільскай эміграцыі заходнебеларускага насельніцтва стаў штат Сан-Паўлу, дзе эмігрантам прадстаўлялася праца на плантацыях кавы. Трапічны клімат і неспрыяльныя для еўрапейцаў умовы існавання рабілі працу на плантацыях кавы вельмі цяжкай, а адаптацыю – складанай і доўгай. Аднак толькі дзякуючы працы на кававых плантацыях малазямельныя і беззямельныя заходнебеларускія эмігранты маглі набыць уласны кавалак зямлі. Так, у газеце «Эмігрант» адзначалася: «Урад штату Сан-Паўлу мае намер пакрыць сродкі праезду сельскагаспадарчым сем'ям, разлічваючы на тое, што не ведаючы мовы і мясцовых звычаяў, тыя ў канчатковым выніку будуць задзейнічаны на плантацыях кавы. А пакуль яны заробяць грошай, то пройдзе шмат гадоў. Такая праца з'яўляецца сапраўднай няволей. У трапічным клімаце Сан-Паўлу рабочы з Польшчы не вытрымае працы на плантацыях кавы» [16, с. 252].

Аднак цяжкасці ў ажыццяўленні польскай эміграцыйнай палітыкі ў дачыненні да Бразіліі выклікала пазіцыя ўлад гэтай краіны: новыя ўрадавыя пастановы дазвалялі імігрыраваць у Бразілію толькі вызначаным катэгорыям насельніцтва, а пасля прыняцця дэкрэта 31 снежня 1924 г. імігранты павінны былі валодаць пасведчаннем асобы і маральнасці з фотаздымкам і адпячаткамі пальцаў [19, с. 93]. У выпадку адсутнасці дадзеных дакументаў бразільскія ўлады за ўласны кошт маглі дэпартаваць імігранта. Транспарціроўка імігрантаў па дэкрэце 1924 г. ажыццяўлялася толькі кампаніямі, вызначанымі бразільскім урадам.

Нягледзячы на неймаверныя цяжкасці працы на плантацыях кавы, дадзены від эміграцыі быў распаўсюджаным сярод перасяленцаў. Паводле даных міжнароднай эканамічнай канферэнцыі 1927 г. і М. Шаўлеўскага, усяго на працягу 1921–1925 гг. з Польшчы ў Бразілію выехала 5 022 чалавекі, з якіх па 40% складалі яўрэі і палякі, 20% – беларусы. Такім чынам, можна меркаваць, што ў 1921–1925 гг. з Заходняй Беларусі ў Бразілію выехала каля 1 000 чалавек [20, с. 113; 21, л. 41–42; 22, с. 26].

У другой палове 1920-х гг. эміграцыя ў Бразілію адрознівалася хуткім ростам маштабаў перасялення. Палітыка польскіх улад была накіравана на здабыццё новых рэгіёнаў для сельскагаспадарчай эміграцыі. У пачатку 1925 г. Эміграцыйнае ўпраўленне накіравала ў Бразілію спецыяльную камісію на чале з К. Вархалёўскім, якая павінна была даследаваць іміграцыйныя магчымасці гэтай краіны [16, с. 253 ]. Вынікам працы стала падпісанне ў лютым 1927 г. дырэктарам Варшаўскага эміграцыйнага сіндыкату С. Гаўронскім пагаднення з урадам штату Сан-Паўлу адносна працаўладкавання мігрантаў [23, л. 71, 91; 24, л. 41]. У мэтах яе выканання ўпраўленне распрацавала інст-

рукцыю па арганізацыі перасяленняў. Згодна з ёй, адказнасць за набор эмігрантаў была ўскладзена на Дзяржаўнае ўпраўленне пасрэдніцтва працы. Канчатковае рашэнне выносіла кваліфікацыйная камісія ў складзе дырэктара ўпраўлення пасрэдніцтва працы, дэлегатаў каланізацыйнага таварыства і доктара. У рабоце камісіі меў права ўдзельнічаць дэлегат ад ўраду штата Сан-Паўлу. Па прыбыцці ў порт Сантас (штат Сан-Паўлу) у прысутнасці чыноўніка Эміграцыйнага ўпраўлення Польшчы адбывалася падпісанне пагаднення паміж эмігрантамі і арандатарамі, згодна якога бразільскі бок пакрываў усе выдаткі за праезд. Перасяленцы павінны былі быць ва ўзросце ад 14 да 50 гадоў, фізічна здаровымі, здольнымі да сельскагаспадарчай працы, з добрымі маральнымі характарыстыкамі, якія пацвярджаліся мясцовымі органамі ўлады. Кожная сям'я эмігранта павінна была складацца як мінімум з чатырох чалавек [19, с. 91–92.].

У кастрычніку 1928 г. Варшаўскае каланізацыйнае таварыства атрымала ад урада штата Эспірыту-Санта канцэсію агульным коштам 1 млн мілрэйсаў (375 тыс. зл.) на каланізацыю 50 тыс. га зямлі 300 сельскагаспадарчымі сем'ямі [23, л. 71, 91; 24, л. 41]. А ў 1929 г. было заключана пагадненне з Варшаўскім каланізацыйным таварыствам на каланізацыю 50 тыс. га зямлі, дзе на працягу 8 гадоў павінны былі пасяліцца 1 800 сем'яў з Польшчы. На гэтай ніве каланізацыйнае таварыства заснавала калонію «Агіа Бранка» («Белы арол») [25, л. 1]. Здавалася б, адсутнасць абмежаванняў эміграцыі ў калонію павінна было выклікаць зацікаўленнасць у эмігрантаў. Аднак эміграцыя ў гэым накірунку не атрымала вялікага распаўсюджання, бо пагадненне было заключана ў перыяд эканамічнай нестабільнасці ў Бразіліі і не мела практычнага значэння.

Перад выездам у калонію эмігрантамі выплачваўся задатак ў памеры 500 злотых. Астатняя сума дзялілася на тры роўныя часткі, аплата якіх пачыналася з чацвёртага году каланізацыі. Пры аднаразовай выплаце поўнага кошту зямельны надзел абыходзіўся эмігрантам у 860 злотых [23, л. 59; 25, л. 70]. Праезд у калонію для дарослай асобы (ад 10 гадоў) складаў каля 667 злотых, для дзяцей ад 5 да 10 гадоў – каля 333 злотых і для дзяцей ад 1 да 5 гадоў – каля 166 злотых [26, л. 141].

Тэрыторыя калоніі «Агіа Бранка» мела некалькі сельскагаспадарчых цэнтраў: Агіа Бранка (81 га), Монтэ Карла (71 га), Кашуэйра-дас-Кобры (100 га). У 1930–1931 гг. Марская і каланіяльная ліга ажыццявіла пашыраную каланізацыю тэрыторыі Агіа Бранка: былі каланізаваны тэрыторыі Жабоцікал і Сан-Габрыэль-да-Палья. Асноўную масу каланістаў складалі сялянскія сем'і (у сярэднім 97 сем'яў), якія апрацоўвалі каля 100 зямельных надзелаў плошчаю ў 3 000 га. Першая група заходнебеларускіх эмігрантаў прыбыла ў калонію «Агіа Бранка» ў 1929 г. [27, л. 209].

Складаныя кліматычныя ўмовы і неадпаведныя санітарна-гігіенічным нормам умовы працы і жыцця ў калоніі «Агіа Бранка» нярэдка былі прычынай узнікнення і распаўсюджвання эпідэмій. У 1930–1932 гг. было зарэгістравана каля 3 000 выпадкаў інфекцыйных захворванняў [27, л. 99; 28, л. 184]. Акрамя таго, распаўсюджанай з'явай былі трафічныя язвы, інфекцыйныя захворванні [29, с. 141; 30, л. 3; 31, л. 4]. У сувязі са складанай эпідэміялагічнай сітуацыяй назіраліся ўцёкі эмігрантаў з тэрыторыі «Агіа Бранкі». Напрыклад, на 1 студзеня 1938 г. агульная колькасць эмігрантаў у калоніі складала 335 сем'яў, з якіх 254 сям'і (75,82%) пакінулі межы калоніі [27, л. 234]. Акрамя таго, эмігранты, якія пакідалі тэрыторыю калоніі «Агіа Бранка», неаднаразова сцвярджалі, што прадстаўнікі Варшаўскага каланізацыйнага бюро і Эміграцыйнага сіндыкату давалі недакладную інфармацыю аб умовах працы і жыцця ў калоніі, не паведамлялі аб існаванні трапічных захворванняў і адсутнасці механізацыі працы [29; 30, л. 22].

Вынікам настойлівай эміграцыйнай палітыкі польскага ўрада з'явілася павелічэнне ў другой палове 1920-х гг. колькасці заходнебеларускіх эмігрантаў у Бразіліі. Паводле звестак польскай афіцыйнай статыстыкі, у 1927–1928 гг. з Заходняй Беларусі ў паўднёвыя землі Бразіліі выехала 857 чалавек (1927 г. – 379, 1928 г. – 478). З аналізу

табліцы 1 вынікае, што найбольшую распаўсюджаннасць у 1927–1928 гг. у заходнебеларускім рэгіёне атрымала эміграцыя з Палескага ваяводства, якая складала амаль 60% ад агульнай колькасці заходнебеларускіх эмігрантаў. Нізкі паказчык эміграцыі на працягу двух гадоў назіраўся ў Віленскім (11%) і Навагрудскім (7%) ваяводствах [31–33].

Табліца 1 – Эміграцыя з Заходняй Беларусі ў Бразілію ў 1927–1928 гг., чал.

| Год | Ваяводства | | | | Разам |
|---|---|---|---|---|---|
| | Беластоцкае | Віленскае | Навагрудскае | Палескае | |
| 1927 | 50 | 20 | 31 | 278 | 379 |
| 1928 | 123 | 72 | 29 | 254 | 478 |

*Складзена на падставе [31].*

Аднак згодна статыстычных справаздач мясцовых органаў з Віленскага ваяводства, ў 1927–1928 гг. у Бразілію выехала 209 чалавек, а гэта ў 2 разы больш, чым паводле даных статыстыкі МУС Польшчы. Па іх звестках найбольшая актыўнасць эмігрантаў Віленскага ваяводства выявілася ў 1928 г. ў Маладзечанскім (116 чалавек) і Віленскім (59 чалавек) паветах [32, л. 6–22].

На фоне сусветнага эканамічнага крызісу і хуткага росту беспрацоўя ва ўсім свеце ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. польскія афіцыйныя ўлады імкнуліся вырашыць складанае сацыяльна-эканамічнае становішча заходнебеларускага краю шляхам наладжвання эміграцыі. Начальнік аддзела Варшаўскага эміграцыйнага сіндыкату Ф. Гадомскі адзначаў: «Беспрацоўныя элементы ў Польшчы яшчэ не зусім дэмаралізаваныя. Нарэшце ў нас, як у сельскагаспадарчай краіне, у працоўных яшчэ жывая традыцыя працы на зямлі. Улічваючы гэта, існуе магчымасць ўладкавання часткі беспрацоўных у заакіянскіх краінах, дзе пануе экстэнсіўная форма сельскай гаспадаркі, што дазволіла б перачакаць эканамічны крызіс, які скаваў увесь свет» [16].

Дзякуючы намаганням Ф. Гадомскага ад польскага ўрада была атрымана шырокая фінансавая падтрымка для ажыццяўлення каланізацыі бразільскіх тэрыторый. Яго падтрымаў і старшыня Савета міністраў Польшчы К. Світальскі, які ў адкрытым лісце выказаў поўнае разуменне намераў Варшаўскага каланізацыйнага таварыства, «прызнаючы каланізацыйную акцыю карыснай і мэтанакіраванай» [16]. У лютым 1929 г. каланізацыйнае таварыства атрымала канцэсію ад бразільскага ўрада на каланізацыю 50 тыс. га зямлі ў штаце Эспірыту-Санту. Маючы значную падтрымку ва ўрадавых колах, каланізацыйнае таварыства ў сакавіку 1929 г. атрымала дазвол міністра працы і сацыяльнай апекі на набор перасяленцаў у Бразілію. Паводле інструкцыі, эміграцыя насіла калектыўны характар, а кошт падарожжа аплачвалі самі эмігранты. Каардынацыяй вызначэння эмігрантаў займалася Упраўленне пасрэдніцтва працы. Працэдура афармлення эмігрантаў была такой, як пры эміграцыі ў штат Сан-Паўлу ў 1926 г. Розніца заключалася толькі ў тым, што эмігрант пасля атрымання кваліфікацыі падпісваў з каланізацыйным таварыствам (працадаўцам) пагадненне.

Карыстаючыся падтрымкай афіцыйных улад, прадстаўнікі каланізацыйнага таварыства і агенты мараходных кампаній разгарнулі на заходнебеларускіх землях небывалую агітацыю, вынікі якой не прымусілі сябе чакаць. У 1929 г. эміграцыя з Заходняй Беларусі ў Бразілію была асабліва маштабнай. На прыкладзе Палескага ваяводства можна прасачыць дынаміку павелічэння эміграцыі ў канцы 1920-х гг.: 1926 г. – 115 чалавек, 1927 г. – 278, 1928 г. – 263, 1929 г. – ужо 806 (табліца 2) [34–35].

Аднак эксперымент каланізацыйнага таварыства ў Эспірыту-Санту на працягу 1929–1930 г. не апраўдаў надзеі польскага Варшаўскага эміграцыйнага ўпраўлення: у калоніях пасялілася толькі 135 сем’яў, з якіх некаторыя ў хуткім часе пакідалі

прадстаўленыя ім зямельныя надзелы і падалася ў горад [36, л. 73]. У выніку такіх абставін урад штату забараніў каланізацыйнаму таварыству ажыццяўляць набор новых пасяленцаў з Заходняй Беларусі.

Табліца 2 – Колькасць эмігрантаў з Палескага ваяводства ў Бразілію (1926–1938 гг.), чал.

| Год | 1926 | 1927 | 1928 | 1929 | 1930 | 1931 | 1932 | 1933 | 1934 | 1935 | 1936 | 1937 | 1938 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць | 115 | 278 | 263 | 806 | 334 | 65 | 56 | 69 | 59 | 44 | 351 | 436 | 74 |

*Складзена на падставе [35].*

У пачатку 1930-х гг. па ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі назіралася скарачэнне эміграцыйных плыняў у Бразілію. Першапачатковай прычынай гэтага з'явілася цяжкае эканамічнае становішча плантатараў, якія пачалі плаціць наёмным рабочым мізэрныя грошы. На змяншэнне эміграцыі паўплывала пазіцыя афіцыйных бразільскіх улад. У снежні 1930 г. была забаронена высадка ў портах Бразіліі пасажыраў трэцяга класа, якія не мелі пры сабе працоўных кантрактаў, запрашэнняў ад сваіх блізкіх сваякоў ці хаця б дамовы з каланізацыйнымі таварыствамі [36, с. 386]. Урад Бразіліі неаднаразова рабіў намаганні па стрымліванні іміграцыі (дэкрэт 1930 г. аб зніжэнні іміграцыі ў 1931 г.) [37]. Для зніжэння іміграцыйнага напружання ў Бразіліі Варшаўскае эміграцыйнае ўпраўленне пачало ўстанаўліваць квоты на выдачу замежных пашпартаў. Паводле распараджэння ад 4 лютага 1930 г., на Брэсцкую экспазітуру Эміграцыйнае ўпраўленне выдзяліла квоту ў 710 чалавек [38; 39, л. 1]. Пазней такія эміграцыйныя квоты даводзіліся кожны месяц.

Нягледзячы на змяншэнне хвалі эміграцыі ў 1931 г. з Беластоцкага, Віленскага, Навагрудскага і Палескага ваяводстваў у бразільскім напрамку, менавіта ў 1926–1931 гг. эміграцыйныя працэсы былі найбольш выніковымі: туды выехала 4 274 чалавекі, што было значна больш, чым за астатнія гады міжваеннага перыяду (табліца 3) [40; 41].

Табліца 3 – Эміграцыя з Заходняй Беларусі ў Бразілію ў 1926–1938 гг.

| Ваяводствы | Гады | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 1926–1931 | 1932–1936 | 1937–1938 | 1926–1938 |
| Беластоцкае | 988 | 340 | 243 | 1 517 |
| Віленскае | 856 | 224 | 17 | 1 107 |
| Навагрудскае | 569 | 175 | 6 | 906 |
| Палескае | 1 861 | 579 | 22 | 2 950 |
| Усяго | 4 274 | 1 318 | 288 | 6 480 |

*Складзена на падставе [40; 41].*

1930-я гг. адзначаліся інтэнсіўнай эміграцыйнай палітыкай польскіх улад, якая была вынікам узмацненнем крызісных з'яў у эканоміцы Польшчы. Па-першае, у 1931 г. была рэанімавана Марская і каланіяльная ліга [42, с. 5–15.]. Па-другое, у штаце Парана было ўтворана прадстаўніцтва Марской і каланіяльнай лігі для ажыццяўлення каланізацыі краю [43, л. 74; 44, л. 6]. Аднак павялічыць маштабы эміграцыйных плыняў з Заходняй Беларусі ў той час было вельмі складана. Не прываблівала эмігрантаў і бесперашкодная эміграцыя ў калонію «Агіа Бранка».

У пачатку 1933 г. польскі ўрад прыступіў да рэалізацыі чарговых мерапрыемстваў, накіраваных на падтрымку Варшаўскага каланізацыйнага таварыства, Марской і каланіяльнай лігі: прадстаўлена пазыка ў памеры 120 тыс. злотых для калоніі «Агіа

Бранка» і вылучаны крэдыт у суме 100 тыс. злотых для Марской і каланіяльнай лігі. На атрыманыя ад міністэрства замежных спраў Польшчы грошы планавалася заснаваць у Паране сетку ўзорных калоній, арыентаваных на экспарт прадукцыі ў Польшчу, і будаўніцтва чыгункі, якая павінна злучыць новыя тэрыторыі з Курытыбай [36, л. 82]. Гэта сведчыла, што польскі ўрад спрабаваў выкарыстаць кожную магчымасць для павелічэння эміграцыйных патокаў з Заходняй Беларусі. Аднак рэалізаваць такія намеры было нялёгка, бо ўмовы гаспадарчага ўладкавання на прапанаваных тэрыторыях былі надзвычай складанымі. Па прыбыцці ў галоўны прапускны эміграцыйны пункт Бразіліі, які знаходзіўся паблізу Рыа-дэ-Жанейра, а потым транспарты з эмігрантамі адпраўляліся да Вікторыі (сталіцы штата Эспірыту-Санту). Усё падарожжа з удакладненнем фармальнасцей у порце працягвалася чатыры тыдні [16, с. 260]. Пасля гэтага пасяленцы дабіраліся да калоніі чыгункай, аўтамабільным транспартам і нават муламі. Акрамя таго, з 1 студзеня 1933 г. бразільскае консульства ў Варшаве патрабавала абавязковага медыцынскага агляду ва ўласнага доктара Я. Яхімовіча, што каштавала 12 злотых. Без медыцынскага пасведчання бразільскія візы лічыліся несапраўднымі [43, л. 12].

Абмежавальная іміграцыйная палітыка Бразіліі і складаныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы адаптацыі перасяленцаў замарудзілі і скарацілі ў некалькі разоў эміграцыю з Заходняй Беларусі ў паўднёвыя штаты Бразіліі. Так, у 1931 г. з Палескага ваяводства выехала 65 чалавек, у 1932 г. – 56, у 1933 г. – 69, у 1934 г. – 59, у 1935 г. – 44 [34].

У 1936 г. назіралася ажыўленне эміграцыйных працэсаў, якое было абумоўлена шэрагам фактараў: паляпшэннем кан’юнктуры ў бразільскай эканоміцы і ўзмацненнем дзейнасці Марской і каланіяльнай лігі ў штаце Парана, дзе былі вылучаны новыя каланізацыйныя прасторы без іміграцыйных абмежаванняў. У 1936 г. тут былі створаны калоніі «Марская воля» і «Генерал Дрэшар» [45, л. 241]. Умовы атрымання зямельных надзелаў на гэтых калоніях былі такімі ж, як і ў калоніі «Агіа Бранка». У выніку такой дзейнасці павячылася колькасць эмігрантаў. Напрыклад, у лютым і красавіку 1936 г. толькі ў Пінскі аддзел Эміграцыйнага сіндыкату з заявамі на эміграцыю ў Бразілію звярнуліся 435 асоб, з якіх 351 – выехала [46, л. 1–4].

Наступным крокам па ўзмацненні абжавання іміграцыйнай палітыкі Бразіліі быў эміграцыйны закон аб максімальнай гадавой колькасці эмігрантаў ад 16 ліпеня 1934 г., які ўступіў у дзеянне 15 красавіка 1936 г. і быў пацверджаны Канстытуцыяй Бразіліі 1937 г. Сутнасць закона заключалася ў тым, што іміграваць у Бразілію маглі толькі 2% насельніцтва ад колькасці імігрантаў за апошнія 50 гадоў [47, л. 7]. Для Польшчы колькасныя штогадовыя паказчыкі ў 1936 г. складалі каля 1 800 чалавек, а ў 1938 г. – толькі 535) [48, с. 136]. Такая сітуацыя прывяла да таго, што для заходнебеларускага насельніцтва Бразілія сярод эміграцыйных краін канчаткова адышла на другі план.

Аднак, згодна патаемнаму «эміграцыйнаму» плану 1937 г., Польшча не адмаўлялася ад інтэнсіўнай эміграцыйнай палітыкі з заходнебеларускіх зямель. Для падтрымання выбранага курсу міністэрства замежных спраў Польшчы стала ажыццяўляць намаганні для аднаўлення эміграцыі ў штат Сан-Паўлу. Спрыяла эміграцыйнай палітыцы польскіх улад і цяжкае матэрыяльнае становішча заходнебеларускага насельніцтва. Так, паводле звестак Пінскага аддзела эміграцыйнага сіндыкату, у 1937 г. было пададзена 1 681 заява на выезд у Бразілію, з якіх большая колькасць – у першай палове года (табліца 5). Аднак рэальная колькасць эмігрантаў, якія выехалі ў Бразілію ў 1937 г. з Палескага ваяводства, складала 436 чалавек [49, л. 8–19, 20–36].

У канцы 1930-х гг у бразільскім грамадстве назіраецца ўздымам шавіністычных настрояў. Да ўлады прыходзіць генерал Ж. Варгас, які ўсталёўвае ў Бразіліі аўтарытарную сістэму кіравання, што паўплывала і на працэсы заходнебеларускай эміграцыі. Быў прыняты шэраг законаў, якія абмяжоўвалі свабоду жыцця імігрантаў. Галоўнай задачай такой палітыкі была паскоранная асіміляцыя перасяленцаў. Вынікам гэтага стала за-

крыццё марскіх портаў для замежных караблёў. Першым закрыў мяжу штат Рыа-дэ-Жанейра – галоўны порт прыёму імігрантаў з Еўропы, пасля яго – іншыя штаты, куды накіроўваліся заходнебеларускія жыхары [50, л. 161].

Пікам антыіміграцыйнай палітыкі Бразіліі быў дэкрэт «Аб нацыяналізацыі» («Кодэкс іміграцыі») ад 4 мая 1938 г., які прадугледжваў амаль поўнае спыненне іміграцыі [51, с. 114]. У выніку польская гадавая квота склала 1 230 чалавек [48, с. 137]. Згодна дэкрэта, іміграцыя ў Бразілію павінна была мець выключна сельскагаспадарчы характар: працаўладкоўваць імігрантаў маглі толькі ўласнікі сельскагаспадарчых калоній, якія атрымалі канцэсіі ад дзяржаўных органаў. Артыкулы 39 і 40 Кодэкса утрымлівалі нормы, згодна з якімі ў Бразіліі забаранялася ўтвараць калоніі з прадстаўнікоў адной нацыянальнасці. Паводле дэкрэта, дазваляліся наступныя суадносіны імігрантаў у калоніях: 30% павінны былі складаць бразільцы, астатнюю частку – імігранты (па 25% іншых нацыянальнасцей). Пры атрыманні візы ў бразільскім консульстве ў Варшаве перавагу мелі кроўныя сваякі першай ступені. Заходнебеларускія эмігранты, якія перасяліліся ў Бразілію, абавязваны былі атрымаць у пашпартным аддзеле МЗС у Рыа-дэ-Жанейра пасведчанне аб легальным знаходжанні ў краіне [52, с. 43–58]. Згаданы дэкрэт выклікаў заняпад эміграцыі з Польшчы ў Бразілію. Так, у 1938 г. колькасць эмігрантаў з Польшчы ў гэтым напрамку склала ўсяго 535 чалавек. Калі ў Пінскім аддзеле эміграцыйнага сіндыкату ў 1937 г. было зафіксіравана 1 681 заяў на эміграцыю, то ў 1938 г. іх колькасць паменшылася да 260 (табліца 4). Усяго з Палескага ваяводства ў 1937 г. выехалі 436 чалавек, у 1938 г. – 74 (табліца 2).

Табліца 4 – Колькасць заяў ад насельніцтва Палескага ваяводства на эміграцыю ў Бразілію ў 1937–1938 гг. (паводле звестак Пінскага аддзела эміграцыйнага сіндыкату)

| Год | Па месяцах | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | I | II | III | IV | V | VI | VII | VIII | IX | X | XI | XII | Разам |
| 1937 | 291 | 226 | 341 | 168 | 111 | 112 | 122 | 82 | 39 | 98 | 38 | 53 | 1 681 |
| 1938 | 75 | 38 | 28 | 8 | 17 | 11 | 2 | 5 | 5 | 10 | 36 | 25 | 260 |

*Складзена на падставе [46; 49].*

Такім чынам, эміграцыю ў Бразілію з тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., якая набыла даволі шырокі размах, можна падзяліць на такія перыяды: 1) 1921–1925 гг.; 2) 1926–1931 гг.; 3) 1932–1939 гг. Першы перыяд (1921–1925 гг.) адметны тым, што заходнебеларускія эмігранты накіроўваліся ў штат Сан-Паўлу, дзе працаўладкоўваліся на кававыя плантацыі. Другі (1926–1931 гг.) і трэці (1932–1939 гг.) перыяды эміграцыі ў Бразілію, якія характарызаваліся актывізацыяй дзейнасці эміграцыйных улад Польшчы, каланізацыйных таварыстваў, Марской і каланіяльнай лігі, суправаджаліся павелічэннем колькасці эмігрантаў у паўднёвых рэгіёнах Бразіліі.

На падставе аналізу эміграцыйных статыстычных матэрыялаў устаноўлена, што на працягу міжваеннага перыяду з Беластоцкага, Віленскага, Навагрудскага і Палескага ваяводстваў у паўднёвыя землі Бразіліі выехала каля 6 880 чалавек.

**Сацыяльна-эканамічныя аспекты эміграцыі заходнебеларускага насельніцтва ў Бразілію**

На працягу ўсяго міжваеннага перыяду адміністрацыйна-прававая база міграцыйных адносін Польшчы і Бразіліі неаднаразова дапаўнялася і абмяжоўвалася. Аднак нязменнымі заставаліся абавязковыя патрабаванні да эмігрантаў. Так, бразільскія ўлады дазвалялі ўязджаць у краіну сваім грамадзянам і асобам, якія накіроўваліся ў Бразілію дру-

гім ці першым класам, мелі неіміграцыйны пашпарт (такія пасажыры атрымоўвалі візы без вызначанай квоты). Людзі, якіе мелі бразільскае запрашэнне, пасведчанне маральнасці і пацверджанне адказнасці, таксама маглі атрымаць бразільскую візу [24, л. 12]. Візы ў Бразілію выдаваліся пры наяўнасці дарожнага білета і рэгістрацыйнай карты эмігранта. Кошт візы складаў каля 20 зл. [53, л. 1; 54, л. 1].

У адрозненне ад адзінкавай эміграцыі ў ЗША і Канаду ў Бразілію выязджалі цэлымі сялянскімі сем'ямі. Асаблівасцю эміграцыі ў Бразілію з'яўляецца тое, што яна была маладаступнай для малазямельных і беззямельных сялян, рабочых [1, с. 23]. Інтэлектуальная і прафесійная эміграцыя ў Бразілію не атрымала распаўсюджваня, у сувязі з чым Варшаўскае эміграцыйнае ўпраўленне неаднаразова папярэджвала эмігрантаў аб цяжкасцях пры пошуках працы па спецыяльнасці [55, л. 1]. Першапачатковы капітал эмігрантаў, якія накіроўваліся ў бразільскія калоніі, залежаў ад іх матэрыяльнага становішча і мог адрозніваццa на 500 долараў [56, л. 60].

Транспарціроўку заходнебеларускіх эмірантаў з Еўропы ў порт Рыа-дэ-Жанэйра ажыццяўлялі сусветныя мараходныя кампаніі, якія атрымлівалі канцэсію ад Польшчы. У 1927 г. канцэсію на правоз эмігрантаў атрымала 6 сусветных мараходных кампаній: «Chargeurs Riunis», «Cosulich Line», «KHL», «Nelson line», «Societe Generale de Transports Maritimes a Vapeur», «RML». Караблі адпраўляліся з еўрапейскіх портаў Гданьск, Гаўр, Бардо, Трыест, Амстэрдам, Булонь-сюр-Мэр, Лондан, Ліверпуль, Шэрбург, Саўтгемптан. Працягласць падарожжа ў Бразілію складала тры-чатыры тыдні, а сярэдні кошт дарожнага білета трэцяга класа складаў 107 долараў [57, л. 2]. З буйных гарадоў Бразіліі ўглыб краіны эмігранты дабіраліся чыгункай. З Рыа-дэ-Жанэйра да Паранагуа (Парана) праезд складаў 51,5 долараў, а з Сантаса – 26,8 дол. [58, л. 6].

Эмігранты з Заходняй Беларусі сяліліся пераважна ў штатах Парана, Сан-Паўлу, Эспірыту-Санту, Рыу-Грандзі-ду-Сул, Мінас-Жэрайс, Санта-Катарына [1, с. 21, 27–28; 18, с. 93; 59, л. 295]. Усе яны знаходзіліся ў паўднёвай Бразіліі і валодалі тэрыторыямі, прызначанымі для каланізацыі [52, с. 41–52].

З табліцы 5 добра відаць, што асноўная плошча каланізацыйных зямель Бразіліі размяшчалася ў штаце Парана, менавіта там і была створана найбольшая колькасць польскіх калоній і сельскагаспадарчых цэнтраў, дзе працаўладкоўваліся перасянцы з Заходняй Беларусі.

Табліца 5 – Тэрыторыі, запланаваныя ўрадам Бразіліі для каланізацыі (1934 г.)

| Штат | Плошча каланізацыйнай зямлі, га | Колькасць асаднікаў | Прыблізны кошт 25 га зямлі, злотых |
|---|---|---|---|
| Эспірыту-Санта | 75 000 | 1800 | 1 500 |
| Сан-Паўлу | 700 000 | 20000 | 3 000 |
| Парана | 2 000 000 | 64800 | 1 500 |

*Складзена на падставе [58].*

Вялікая плошча тэрыторыі Параны знаходзілася ў руках каланізацыйных кампаній і ўласнікаў: «Brazil Devlopment Colonisation Company», «Francisce Missine Ag. Banku Fr. Wlosk. Guarapuava», «Affonso Paz do Nacsimento», David Carneiro Kurytyba, «Sociedade Rural Imt. Joinville», Marins Abreu de Camargo, «Cia de Terras Norte do Parana», «Jorge Walter. Koncesja rządowa», урад штата Парана, таварыства замежнай каланізацыі ў Берліне, Паранскае каланізацыйна-гандлёвае акцыянернае аб'яднанне [60, л. 155–156].

Асноўная маса каланіяльных асяродкаў размяшчалася ў цэнтральных муніцыпалітэтах Параны, дзе былі ўтвораны наступныя калоніі і асадніцкія тэрыторыі: «Флорэста», «Парана Плантэйшын», «Маршал Малет», «Араўкарыі», «Новы Гданьск», «Мар-

ская воля», «Варта», «Маркіз Абрантэс», «Куацігуа», «Жоакін Тавора» і інш. [47, л.12; 59, л. 180, 265; 60, л. 38; 61, л. 12].

Яскравым прыкладам польскіх калоній, дзе працаўладкоўваліся заходнебеларускія эмігранты, з'яўляецца калонія «Марская воля». Яна была ўтворана ў 1934 г. і складалася з 348 зямельных надзелаў, з якіх 286 мелі плошчу па 25 га, а астатнія 62 – па 0,6 га. Першыя каланісты патрапілі ў калонію ў 1935 г. Кошт падарожжа складаў каля 2 265 злотых, а зямельны надзел толькі 735 (гэты факт яшчэ раз падцвярджае велізарны кошт білетаў) [62, с. 9–10; 63]. У 1937 г. калонія была заселена толькі на 50%; у падоб-ным стане былі і іншыя эміграцыйныя каланіяльныя суполкі. Дадзеная сітуацыя стала вынікам абмежавальнай іміграцыйнай палітыкі Бразіліі, што прывяло да змены на-прамку плыні эмігрантаў з Заходняй Беларусі на Аргенціну і Парагвай. Калонія «Мар-ская воля» спыніла сваё існаванне ў 1938 г.

У штаце Рыа-грандзі-ду-Сул былі ўтвораны шматлікія калоніі, якія размяшчаліся ў асноўным каля гарадоў Патас Лагуна, Кашыас, Эрэшын і Іжуі. Даволі папулярнай сярод заходніх беларусаў была калонія «Санта Роса». На 1930-я гг. прыпадае найбольшая актыўнасць эміграцыйных перасяленняў: у 1936–1938 гг. у калоніі асела 488 сем'яў з Польшчы, з якіх 285 былі праваслаўнага веравызнання, 127 – рымска-каталіцкага, 35 – грэка-каталікаў, евангелістаў налічвалася 33 сям'і, адвентыстаў – 1 сям'я. З тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1936–1938 гг. у калонію «Санта Роса» выехала 167 сем'яў, большасць якіх эміграцыйныя заявы падавалі ў Пінскі (70) і Беластоцкі (71) аддзелы Варшаўскага эміграцыйнага сіндыкату [64, л. 3].

У штаце Сан-Паўла існавала каланізацыйнае таварыства «Soeiedate Promotora de Colonizacao», якое займалася працаўладкаваннем эмігранатаў на кававых плантацыях [65, л. 4–7]. Фазэнда Гаўтапара з'яўлялася адной з распаўсюджаных кававых плантацый для эмігрантаў [66, с. 8]. У 1935 г. для прадухілення недахопу працоўных рук на плантацыях кавы арандатары пачалі праводзіць агітацыю сярод цэлых сем'яў, якім прадстаўлялася аплата за праезд да Сан-Паўлу ў форме акрэдытавання кошту будучых даходаў. Гэта дазваляла эмігрыраваць нават тым сем'ям, якія не маглі самастойна набыць неабходную для падарожжа суму грошай [48, с. 382; 59, л. 102; 67, с. 96].

У кнізе «У справе эміграцыі да Сан-Паўла» М. Панкевіч заўважаў, што «плантацыі кавы – гэта дарэмная праца, хваробы… кававыя плантацыі не маглі фінансава забяспечыць нашага работніка, дазволіць атрымаць паміраючаму з голаду кавалак хлеба» [67, с. 129]. Аднак, нягледзячы на цяжкасці эмігранцкага лёсу, на працягу 1929–1938 гг. толькі праз пасрэдніцтва Варшаўскага каланізацыйнага таварыства з Польшчы ў Бразілію выехала 38 караблёў з 361 сем'ёй каланістаў [32, л. 234].

Ажыўленне эміграцыйнага руху выклікала рост злоўжыванняў з боку агентаў мараходных таварыстваў. У 1929 г. на Палессі былі выпадкі прымусу і нелегальнай эміграцыі ў Бразілію, аб чым дакладваў камендант дзяржаўнай паліцыі ў Брэсце [68; 69, л. 1; 70, л. 105]. Кіраўнікі мараходных кампаній, напрыклад, за грашовыя ўзнагароджанні прадстаўлялі зацікаўленым асобам інфармацыю аб эміграцыі ў Бразілію. Бывалі выпадкі, што за афармленне дакументаў агенты патрабавалі ад эмігрантаў грашовую суму ў 40 долараў. Вельмі спрытнымі падманшчыкамі эмігрантаў былі і чыноўнікі эміграцыйнага сіндыкату. Для прадухілення нелегальнай і некарэктнай агітацыі па загадзе кіраўніка Брэсцкай экспазітуры эміграцыйнага ўпраўлення Ч. Хэлмоўскага была праведзена праверка дзейнасці агентаў мараходных таварыстваў, у выніку якой некаторыя бюро былі закрыты [70, л. 81–101].

Сацыяльна-эканамічная і псіхалагічная адаптацыя эмігрантаў у бразільскіх калоніях праходзіла ў складаных умовах: многія тэрыторыі былі пазбаўлены ірыгацыйных сістэм і знаходзіліся на вялікай адлегласці ад сродкаў камунікацый. Акрамя таго, на большасці калоній адсутнічала механізацыя працы. Такім чынам, ад эмігрантаў па-

трабаваліся значныя рэсурсы для прыстасавання на зямлі, якімі заходнебеларускія перасяленцы не валодалі.

Для наладжвання культурна-асветніцкай дзейнасці ў Бразіліі польскімі ўладамі рабіліся намаганні па арганізацыі адукацыйнага працэсу, у які былі ўцягнуты і дзеці заходнебеларускіх эмігрантаў [71, с. 85]. Так, для атрымання абавязковай адукацыі ў некаторых муніцыпалітэтах Бразіліі былі адкрыты адукацыйныя школы для дзяцей імігрантаў: у муніцыпалітэце Порта-Алегре дзейнічала польска-бразільская школа імя Т. Касцюшкі [72, с. 9].

Бразілія – адна з лацінаамерыканскіх краін, якая ў 1921–1939 гг. прываблівала заходнебеларускіх эмігрантаў вялікімі плошчамі неапрацаванай зямлі і марамі аб жыцці ў дастатку на ўласнай гаспадарцы. У адрозненне ад польскіх яўрэяў-эмігрантаў, якія канцэнтраваліся ў асноўным у гарадах, дзе ўладкоўваліся на заводы і адкрывалі свае дробныя рамесніцкія лаўкі, былыя заходнебеларускія сяляне працаўладкоўваліся ў асноўным на кававыя плантацыі і сельскагаспадарчыя фазэнды [73, с. 3; 74; 75].

**Заключэнне**

Такім чынам, у выніку даследавання эміграцыі заходнебеларускага насельніцтва ў Бразілію ў 1921–1939 г. зроблены наступныя высновы:

1. На агульным фоне заходнебеларускіх эміграцыйных працэсаў 1920–1930-х гг. распаўсюджанне атрымала эміграцыя ў Бразілію. Яе можна падзяліць на 3 этапы: 1) 1921–1925 гг. – пачатак эміграцыйных перасяленняў на кававыя плантацыі штата Сан-Паўлу; 2) 1926–1931 гг. – найбольш актыўная эміграцыя насельніцтва ў штаты Бразіліі, што было падмацавана палітыкай польскіх улад, накіраванай на асваенне новых рэгіёнаў для эміграцыі; 3) 1932–1939 гг. – перыяд заканадаўчых абмежаванняў эміграцыі з боку бразільскіх улад і спаду маштабаў перасялення.

2. Вялікую ролю ў актывізацыі эміграцыйных плыняў у Бразілію адыгралі каланізацыйныя таварыствы, Марская і каланіяльная ліга, якія атрымлівалі канцэсіі на каланізацыю зямлі ад урадаў Польшчы і Бразіліі. Так былі ўтвораны калоніі «Агія Бранка» ў Эспірыту-Санта, «Марская воля», «Варта», «Новая Воля» і «Генерал Дрэшара» у Паране, «Санта Роса» у Рыа-грандзі-ду-Сул і інш.

3. Асноўная маса заходнебеларускіх эмігрантаў, якія ў 1921–1939 гг. выехалі ў паўднёвыя штаты Бразіліі, – гэта сельскагаспадарчыя рабочыя і рабочыя на кававых плантацыях. Гарадская эміграцыя не атрымала распаўсюджання сярод прадстаўнікоў заходнебеларускай эміграцыі.

4. Найбольш інтэнсіўнае перасяленне заходніх беларусаў назіралася ў паўднёвыя штаты Бразіліі: Парана, Сан-Паўлу, Рыу-Грандзі-ду-Сул, Эспірыту-Санту, Мінас-Жэрайс, Санта-Катарына. На працягу 1921–1939 гг. ў гэтыя штаты з заходнебеларускіх зямель выехала каля 6 880 чалавек.

5. Сацыяльна-эканамічная і псіхалагічная адаптацыя заходнебеларускіх эмігрантаў праходзіла ў складаных умовах: для ўладкавання жылля і сельскагаспадарчай дзейнасці неабходны былі немалыя фінансавыя сродкі, моцнае фізічнае здароўе і бесперапынная праца.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Kula, M. Polonia brazylijska / M. Kula. – Warszawa : Ludowa Spółdzielńa Wydawnicza, 1981. – 230 s.
2. Kula, M. Sukcesy i porażki osadników w Brazylii / M. Kula // Przegląd Polonijny. Vol. 3. – 1977. – № 2. – S. 75–81.
3. Dzieje Polonii w Ameryce Łacińskiej / Red. M. Kula. –Wrocław, 1983. – 159 s.

4. Groniowski, K. Polska emigracja zarobkowa w Brazylii. 1871–1914 / K. Groniowski. – Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1972. – 293 s.
5. Kubina, T. Wśród polskiego wychodźstwa w Ameryce Południowej / T. Kubina. – Potulice, 1938. – 357 s.
6. Ciuruś, E. Polacy w Brazylii / E. Ciuruś. – Lublin, 1977. – 56 s.
7. Żabko-Potopowicz, B. Osadnictwo polskie w Brazylii / B. Żabko-Potopowicz. – Warszawa, 1936. – 128 s.
8. Hempel, A. Polacy w Brazylii / A. Hempel. – Lwów, 1894. – 215 s.
9. Lepecki, M. Parana i Polacy / M. Lepecki. – Warszawa, 1962, – 47 s.
10. Paradowska, M. Polacy w Ameryce Południowej / M. Paradowska. – Wrocław, 1977. – 315 s.
11. Paradowska, M. Podróżnicy i emigranci. Szkice z dziejów polskiego wychodźstwa w Ameryce Południowej / M. Paradowska. – Warszawa, 1984. – 34 s.
12. Dobosiewicz, Z. Polonia w Ameryce Łacińskiej / Z. Dobosiewicz, W. Rómmel. – Lublin, 1977. –247 s.
13. Gawryszewski, A. Ludność Polski w XX wieku / A. Gawryszewski. – Warszawa : Instytut Geografii i Przestrzennego Zagospodarowania im. Stanisława Leszczyńskiego PAN, 2005. – 622 s.
14. Kicinger, A. Polityka emigracyjna II Rzeczypospolitej / A. Kicinger // Central European Forum for Migration Research. Working Paper. – Warszawa : CEFMR, 2005. – № 4. – 82 s.
15. Malinowski, M. Ruch polonijny w Argentynie i Brazylii w latach 1989–2000 / M. Malinowski. –Warszawa, 2005. – 324 s.
16. Качараба, С.П. Еміграція з Західної України (1919–1939) / С.П. Качараба. – Львів : Львів. нац. ун-т імені І. Франка, 2003. – 415 с.
17. Шваб, А.Г. Еміграція з Волині в 1921–1939 рр. : автореф. дис. ... канд. гістор. наук: 7.00.01 / Р.І. Шваб; НАН України; Чернівецький держ. ун-т ім. Ю. Федьковича. – Чернівці, 1996. – 23 с.
18. Polityka imigracyjna w Brazylii // Kwartnik Instytutu Naukowego do badań emigracyjnych i kolonizacyjnych. – 1927. – T. 2. – S. 87–94.
19. Kołodziej, E. Dzieje Polonii w zarysie 1918–1939 / E. Kołodziej. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1991. – 336 s.
20. Szawleski, M. Kwestia emigracji w Polsce / M. Szawleski. – Warszawa : Wyd-wo Polskiego Towarzystwa Emigracyjnego, 1927. – 210 s.
21. Archiwum Akt Nowych (AAN). – Zespół MSZ. – K. 9889.
22. Szawleski, M. Ludność, emigracja i przeludnienie w Europie powojennej / M. Szawleski // Ekonomista, Warszawa, 1927. – T. 2, 3. – S. 76–114.
23. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9811.
24. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 2082. – Воп.1. – Спр. 14.
25. Дзяржаўны гістарычны архіў у г. Львове (ДГАЛ). – Фонд 799. – Воп. 1. – Спр. 7.
26. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9809.
27. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9812.
28. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9642.
29. Medycyna. – 1932. – № 3–4. – 21 lut. – S. 141.
30. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9813.
31. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9725.
32. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы (ЦДАЛ). – Фонд 51. – Воп. 17. – Спр. 86.
33. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9819.
34. Emigracyjny przegłąd. – 1926. – T. 2.

35. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9886.
36. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9850.
37. Polesie (Brześć nad Bugiem). – 1931. – 17 maja.
38. ДГАЛ. – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 631.
39. ДГАЛ. – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 622.
40. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9883.
41. Zaruchta, A. Dwudziestolecie emigracji z Polski (1918–1938) / A. Zaruchta. – Warszawa, 1939.
42. Orlicz-Dreszer, G. Program Ligi Morskiej i Kolonjalnej / G. Orlicz-Dreszer. – Warszawa : Wyd-wo Ligi Morskiej i Kolonjalnej, 1933. – 16 s.
43. ДАБВ. – Фонд 377. – Воп. 1. – Спр. 1.
44. ЦДАЛітвы. – Фонд 1187. – Воп. 1. – Спр. 35.
45. ДАБВ – Фонд 2082. – Воп. 1.– Спр. 5.
46. ДАБВ – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 76.
47. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9578.
48. Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszych (XVIII–XX) / Pod. red. A. Pilcha. – Warszawa : Państwowe wyd-wo Naukowe, 1984. – 537 s.
49. ДАБВ. – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 77.
50. ДАБВ. – Фонд 2082. – Воп.1.– Спр. 130.
51. Klasa, A. Akcja nacjonalizacyjna w Brazylii a sytuacja Polonii brazylijskiej w okresie poprzedzającym wybuch II wojny światowej / A. Klasa // Przegląd Polonijny. – Z. 1. – Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk. – 1975. – S. 114–121.
52. Krasiński, M. Sytuacja zbiorowości polonijnych i innych grup imigranckich w Brazylii w dobie ustaw nacjonalistycznych prezydenta Vargasa / M. Krasiński // Przegląd Polonijny. – Wrocław–Warszawa : Wyd-wo PAN, 1979. – Zesz. 1 (11). – S. 41–52.
53. ДГАЛ. – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 616.
54. ДГАЛ. – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 558.
55. ДГАЛ. – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 634.
56. ДГАЛ. – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 618.
57. ДГАЛ. – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 632.
58. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9577.
59. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9820.
60. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9804.
61. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9802.
62. Kolonizacja Nowej Woli (z cyklu «Gawędy kolonjalne») // Polska na Morzu. – № 1. – Styczeń 1935. – S. 9–10.
63. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9577.
64. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9791.
65. Emigracja w Sao Paulo. Fazenda Gautapara // Kwartnik Instytutu Naukowego do badań emigracyjnych i kolonizacyjnych. – 1927. – T. 2. – S. 5–40.
66. Kołodzej, E. Wychodźstwo zarobkowe z Polski. 1918–1939 / E. Kołodzej. – Warszawa : Książka i wiedza, 1982. – 291 s.
67. Emigracja w Sao Paulo (Artykuł z książkM. Panke wicza «W sprawe emigracji w Sao Paulo») // Kwartnik Instytutu Naukowego do badań emigracyjnych i kolonizacyjnych. – 1926. – T. 1. – C. 129–131.
68. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9803.
69. ДАБВ. – Воп. 1. – Спр. 237.
70. ДАБВ. – Воп. 1. – Спр. 5.
71. Olcha, A. Emigracja polska w Brazylii: 100 lat osadnictwa / A. Olcha, A. Kaczmarek. – Warsawa : Ludowa Spółdzielna Wydawnicza, 1971. – 551 s.

72. Robotnik Polski. – 1938. – №9 (6 marca).
73. Новое русское слово. – Нью-Йорк. – 1930. – 27 июля.
74. Pamiętniki emigrantów. Ameryka Południowa. – Warszawa, 1939. – 323 s.
75. Wskazówki dla wychodźców do Brazylji (Mała bibljoteka emigranta polskiego № 4). – Warszawa, 1929. – 58 s.

***Miarchuk V.*** **Economic Emigration from the Western Part of Belarus in Brazil from 1921 to 1939**

The article provides information about the economic emigration from the western part of Belarus to Brazil from 1921 to 1939. It was based on archival sources which reconstruct administrative-territorial settlement of Belarusian immigrants into the western part of Brazil, also periods of emigration to this country were marked and the structure of emigration relationship between Poland and Brazil was reflected. The author reveals the socio-economic aspects of the inter-war immigration in Brazil, defines its features for the western region of Belarus, and also investigated the adaptation by Belarusian emigrants from the western part, who were looking for a better life and were forced to sell their property and to leave their homes for further emigration to Brazil's coffee plantations and agricultural colonies.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 22.02.2013